(6)


УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускай літаратуры і культуры


# МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ МІНУЛАГА БЕЛАРУСІ Ў П'ЕСАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА І АЛЯКСЕЯ ДУДАРАВА

33-02-14/2015/6

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ


Дыпломная работа
студэнткі 503 групы
5 курса спецыяльнасці
«Замежная мова (англійская).
Беларуская мова і літаратура»
дзённай формы
атрымання адукацыі
_____________Максімюк
Вольгі Аляксандраўны


Дапушчана да абароны

Загадчык кафедры ___________

Пратакол № 10 ад 30.04.2015 г.

Абаронена 16.06 2015 г.
з адзнакай 10 «дзесяць»


Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
_____________Гоўзіч І.М.


Мінск, 2015

Scanned by CamScanner

# РЭФЕРАТ

Максімюк Вольга Аляксандраўна

## МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ МІНУЛАГА БЕЛАРУСІ Ў П’ЕСАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА І АЛЯКСЕЯ ДУДАРАВА

**Ключавыя словы:** драматургія, гістарычная п’еса, мастацкі вобраз, інтэрпрэтацыя, канфлікт, герой, тыпалогія вобразаў, аўтарская пазіцыя.

**Мэта даследавання** – праз комплексны аналіз п’ес Уладзіміра Караткевіча і Аляксея Дударава выявіць і прааналізаваць своеасаблівасць інтэрпрэтацыі мінулага Беларусі.

**Прадмет даследавання** – мастацкая інтэрпрэтацыя мінулага Беларусі ў п’есах Уладзіміра Караткевіча і Аляксея Дударава.

**Аб'ект даследавання** – драматычныя п’есы Уладзіміра Караткевіча («Званы Віцебска», «Кастусь Каліноўскі», «Калыска чатырох чараўніц», «Млын на Сініх Вірах») і Аляксея Дударава («Князь Вітаўт», «Палачанка», «Чорная панна Нясвіжа», «Усяслаў Чарадзей»).

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалогія даследавання грунтуецца на сістэмна-тыпалагічным, комплексным падыходзе да літаратурна-эстэтычных з’яў, на дасягненнях кампаратывістыкі, герменеўтыкі, тыпалогіі, параўнальна-гістарычнага літаратуразнаўства. Базіснымі, дамінантнымі для аўтара працы сталіся гісторыка-тэарэтычныя напрацоўкі вядомых беларускіх і рускіх даследчыкаў літаратуры: А. Вераб’я, І. Шаладонава, П. Васючэнкі, С. Лаўшука, А. Мальдзіса, В. Халізева і інш.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў паглыбленні, удакладненні і вызначэнні асаблівасці інтэрпрэтацыі гістарычнага мінулага ў драматычных творах Уладзіміра Караткевіча і Аляксея Дударава. Упершыню праведзена параўнальнае супастаўленне і размежаванне спецыфікі спасціжэння і адлюстравання гістарычных падзей названымі драматургамі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і асноўныя палажэнні даследавання могуць знайсці прымяненне ў лекцыях па сучаснай літаратуры, пры распрацоўцы спецкурсаў у ВНУ, урокаў і факультатыўных заняткаў па тэмах «Творчасць Уладзіміра Караткевіча», «Творчасць Аляксея Дударава», «Сучасная беларуская драматургія» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Scanned by CamScanner